УДК 37.02+004

*У. Б. Балабанаў, Т. М. Балабанава*
*Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў*
*Рэспубліцы Беларусь*

# АСАБЛІВАСЦІ ЭВАЛЮЦЫІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ ВА ЎМОВАХ АКТЫЎНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ СУЧАСНЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

*У артыкуле разглядаюцца актуальныя праблемы выкладання замежных моў ва ўмовах актыўнага ўкаранення ў навучальны працэс сучасных інфармацыйных тэхналогій. Асобая ўвага нададзена праблеме павышэння матывацыі навучэнцаў пры вывучэнні замежных моў. Разглядаюцца пытанні эфектыўнасці выкарыстання камп'ютарных тэхналогій падчас аўдыторных заняткаў па замежнай мове. Вывучаюцца асноўныя вартасці і недахопы электронных дыдактычных сродкаў у параўнанні з традыцыйнымі друкаванымі вучэбнымі выданнямі.*

***Evolution of methods of teaching foreign languages in terms of active use of modern information technologies***

*The article deals with current problems of teaching foreign languages with an active adoption of modern information technologies in the educational process. Special attention is paid to the problem of increasing the motivation of students in the study of foreign languages. The authors consider the effectiveness of computer technologies used in classroom teaching of foreign languages. The main advantages and disadvantages of electronic teaching tools compared to traditional printed textbooks are examined.*

На сучасным этапе ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця міжнароднага супрацоўніцтва практычна ва ўсіх галінах эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця грамадства вывучэнне замежных моў з'яўляецца надзённай неабходнасцю для будучых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У сувязі з гэтым у Рэспубліцы Беларусь прадпрымаюцца актыўныя меры па ўдасканаленні адукацыйнай палітыкі ў галіне навучання замежным мовам. Дадзеныя меры накіраваны на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у розных прафесійных галінах для забеспячэння далейшага эканамічнага росту ў дзяржаве за кошт выкарыстання высокакваліфікаванай працоўнай сілы. Падобныя тэндэнцыі патрабуюць прыняцця неадкладных мер па ўдасканаленні методыкі выкладання замежных моў дзеля таго, каб павысіць якасць навучання пры адначасовым павелічэнні аб'ёмаў вучэбнага матэрыялу пры нязменнай колькасці аўдыторных гадзін, адведзеных на вывучэнне дадзенай дысцыпліны. Рашэнне гэтай задачы спалучана з неабходнасцю перагляду традыцыйных падыходаў да навучання замежным мовам з мэтай павышэння матывацыі

навучэнцаў за кошт прыцягнення ўвагі да сучаснага моўнага матэрыялу шляхам складання спецыялізаваных друкаваных і электронных дапаможнікаў.

Электронныя сродкі навучання, на першы погляд, даюць ідэальныя магчымасці для навучання замежным мовам, таму што электронныя рэсурсы дазваляюць максімальна задзейнічаць мультымедыйныя сродкі для комплекснага ўдасканалення навыкаў валодання рознымі відамі маўленчай дзейнасці, што з’яўляецца вельмі неабходным для якаснага засваення моўнага матэрыялу. Акрамя таго, выкарыстанне электронных слоўнікаў дае унікальную магчымасць значнага скарачэння затрат часу на пошук лексічных адзінак. Але на справе не ўсё так ідэальна, і выкарыстанне электронных рэсурсаў можа выклікаць у вучняў зваротны, негатыўны эфект, які характарызуецца мінімізацыяй намаганняў, што прыкладаюцца да вывучэння дысцыпліны. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем вылучыць асноўныя прынцыпы і метады выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій у працэсе навучання замежным мовам і іх камбінавання з традыцыйнымі друкаванымі дыдактычнымі матэрыяламі.

Практыка паказвае, што цалкам электронныя навучальныя дапаможнікі, трэнажоры і нават комплексы маюць высокую эфектыўнасць пры ўмове наяўнасці ўнутранай матывацыі навучэнцаў. Іншымі словамі, навучэнцы павінны быць зацікаўлены ў атрыманні ведаў, а не ў банальнай падрыхтоўцы мінімуму да заліку або іспыту. Пры выкананні гэтай умовы электронныя дыдактычныя сродкі выступаюць у якасці ўніверсальнай крыніцы вучэбнай інфармацыі і кантролю атрыманых ведаў, што дае шырокія магчымасці для арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў. А выкладчык у такім выпадку выступае ў ролі кансультанта і накіроўвае працу навучэнцаў у метадычна правільным напрамку. Аднак, на жаль, часцей даводзіцца сутыкацца з сітуацыямі, калі дысцыпліна «замежная мова» ўспрымаецца навучэнцамі як клопат, і яны імкнуцца мінімізаваць свае выдаткі сіл і часу на вывучэнне матэрыялу, выконваючы толькі аб’ём працы, неабходны для атрымання мінімальнай станоўчай адзнакі. Пры такім раскладзе электронныя дыдактычныя сродкі цалкам губляюць сваю асноўную функцыю. Тут «на дапамогу» навучэнцам прыходзяць рознага роду электронныя перакладчыкі, інтэрнэт-крыніцы і г. д., якія дазваляюць выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі, хутчэй, для стварэння ілюзіі сваёй «крапатлівай» працы, чым для павышэння агульнага ўзроўню валодання замежнымі мовамі.

У сілу сказанага вышэй, можна зрабіць выснову аб неабходнасці перагляду методыкі выкладання замежных моў такім чынам, каб мінімізаваць магчымыя рызыкі, звязаныя з актыўным укараненнем інфармацыйных тэхналогій у навучальны працэс. Справа ў тым, што на сучасным этапе нельга

заставацца ў баку ад агульнасусветных тэндэнцый у сферы інфарматызацыі адукацыі, якія, як вядома, даюць падставу для шматлікіх пераваг ў параўнанні з традыцыйнай методыкай, якая характарызуецца пераважным выкарыстаннем друкаваных дыдактычных матэрыялаў і «аўтарытарнай» роляй педагога. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць аптымізацыі навучальных праграм і дыдактычных матэрыялаў такім чынам, каб забяспечыць планамерны рост эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу і не дапусціць зніжэння матывацыі навучэнцаў. Гэта вельмі працаёмкі працэс, які патрабуе ад педагогаў максімальнай канцэнтрацыі на вырашэнні дадзенай задачы шляхам складання новых дыдактычных матэрыялаў такім чынам, каб забяспечыць магчымасць росту для матываваных вучняў на любым з этапаў вывучэння мовы, але адначасова трэба надаць дастаткова ўвагі тым, чый узровень валодання замежнай мовай знаходзіцца на пачатковай стадыі. Падобная карціна неаднастайнасці ўзроўню і матываванасці навучэнцаў характэрная практычна для ўсіх навучальных устаноў, але мы асноўную ўвагу ўдзелім сістэме вышэйшай адукацыі, спецыфіка якой складаецца ў сфарміраванай прафесійнай накіраванасці навучання з мэтай падрыхтоўкі рознабакова развітых спецыялістаў для розных галін эканомікі сучаснай дзяржавы.

Зыходзячы з вышэй сказанага, можна зрабіць выснову аб высокай ступені мэтазгоднасці камбінавання традыцыйнай методыкі правядзення аўдыторных заняткаў з інавацыйнымі метадамі арганізацыі самападрыхтоўкі навучэнцаў. Так, напрыклад, практыка паказвае, што адпрацоўка граматычнага матэрыялу на аснове электронных тэставых заданняў розных відаў з функцыяй аўтаматычнай праверкі выніку і магчымасцю выбару тыпу тэсту паказала сябе дастаткова эфектыўнай, пры гэтым у навучэнцаў ёсць магчымасць аўтаномнай працы і самааналізу. Неабходна, каб у трэніровачных тэстах была магчымасць аўтаматычнага пераходу ў патрабуемую частку тэарэтычнага граматычнага даведніка (як правіла, на аснове гіпертэкставых спасылак). Гэта дазваляе навучэнцам у выпадку ўзнікнення цяжкасцяў з выкананнем заданняў азнаёміцца з адпаведным правілам. А вось у комплексах кантрольных электронных тэстаў падобная функцыя павінна быць выключана. Тэставыя заданні павінны адпавядаць усім патрабаванням, што прад'яўляюцца да дадзенага тыпу дыдактычных матэрыялаў. Аднак электронныя тэсты не могуць цалкам замяніць сабой традыцыйныя граматычныя практыкаванні, якія выконваюцца пад кантролем выкладчыка, які дае вусныя тлумачэнні і каментарыі датычна таго ці іншага граматычнага правіла або спецыфікі ўжывання выключэнняў.

Электронныя дыдактычныя матэрыялы таксама цалкам дарэчныя для развіцця навыкаў ўспрымання іншамоўнай прамовы на слых, таму што

выкарыстанне якасных мультымедыйных аўтэнтычных аўдыё- і відэаматэрыялаў дазваляе павысіць цікавасць навучэнцаў да прадмета і аптымізаваць самастойную працу шляхам распрацоўкі спецыяльных заданняў.

А вось для працы з тэкстамі і лексічнымі практыкаваннямі ў большай меры падыходзяць традыцыйныя друкаваныя дапаможнікі і падручнікі. Гэта тлумачыцца тым, што падобная праца патрабуе карпатлівага пошуку значэнняў лексічных адзінак па слоўніку (у тым ліку і электроннаму), выключаючы магчымасць выкарыстання сучасных аўтаматызаваных сістэм перакладу. Гэты працаёмкі працэс спрыяе лепшаму засваенню лексічнага матэрыялу, а вусная праца ў аўдыторыі дазваляе эфектыўна актывізаваць вывучаныя лексічныя адзінкі.

У наш час ва ўстановах адукацыі ўсё часцей можна сустрэць сучасныя лінгафонныя кабінеты, у якіх працоўныя месцы навучэнцаў і выкладчыка абсталяваны камп’ютарамі, аб’яднанымі ў лакальную сетку. Падобныя тэхналогіі, на першы погляд, падаюць практычна бязмежныя магчымасці для метадычнай арганізацыі аўдыторнай працы. Аднак нават такія тэхналогіі могуць апынуцца бескарыснымі, калі перагляд методыкі выкладання звядзецца толькі да татальнага пераходу на электронныя сродкі навучання і кантролю ведаў у шкоду класічным падыходам да арганізацыі аўдыторнай працы. Падобны сцэнар вельмі непажаданы, бо ў вучняў пачынае фармавацца выразная ўзаемасувязь паміж замежнай мовай і камп’ютарам, і пасля ім становіцца ўсё цяжэй развіваць навыкі спантаннага гаварэння. Зручнасць карыстання электроннымі слоўнікамі і перакладчыкамі, з аднаго боку, дазваляюць значна эканоміць час, затрачаны на пошукі незнаёмых лексічных адзінак, але з іншага боку, такое скарачэнне часу, затрачанага на працу са слоўнікам, здольна знізіць матывацыю да запамінання лексікі.

Нельга таксама цалкам замяшчаць электроннымі тэстамі класічныя практыкаванні на адпрацоўку граматычных правілаў. Справа ў тым, што ў электронных тэстах (асабліва ў заданнях на выбар аднаго правільнага варыянту з некалькіх прапанаваных) закладзена патэнцыяльная небяспека ўгадвання адказу. У той жа час, дзеля таго, каб выканаць традыцыйнае граматычнае практыкаванне з друкаванай крыніцы, вучню неабходна больш абапірацца на веданне правілаў, пры гэтым прагаворванне заданняў ўслых дазваляе задзейнічаць адначасова некалькі органаў ўспрымання, што спрыяе большай эфектыўнасці запамінання не толькі граматычнага, але і лексічнага матэрыялу, а таксама візуальнага «фатаграфавання» арфаграфіі.

Традыцыйна навучэнцы завочнай формы ў міжсесійны перыяд выконвалі ў пісьмовай форме хатнія кантрольныя работы. У апошні час усё большую папулярнасць набываюць дыстанцыйныя формы кантролю ведаў з

выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій і магчымасцяў сусветнай камп'ютарнай сеткі. У спрошчанай (і найбольш распаўсюджанай) форме падобны кантроль уяўляе сабой комплекс электронных заданняў / тэстаў, часам ад навучэнцаў патрабуецца дыстанцыйна адправіць экзаменатару тэкставы файл з выкананымі заданнямі. Падобны тып дыстанцыйнага кантролю мае адзін вялікі недахоп, які выяўляецца ў высокай рызыцы прадстаўлення навучэнцамі несамастойна выкананых работ. У больш тэхналагічна развітых сістэмах існуе магчымасць арганізацыі відэаканферэнцыі паміж выкладчыкам і навучэнцамі, што істотна скарачае рызыку падробкі адказаў. Але для арганізацыі падобных сістэм дыстанцыйнай адукацыі і кантролю ведаў неабходна, каб камп'ютарная тэхніка і хуткасць сеткавага злучэння адпавядалі больш высокім сучасным стандартам, што патрабуе больш істотных матэрыяльных выдаткаў як для навучальнай установы, так і для навучэнца, і гэта часта з'яўляецца цяжкапераадольнай перашкодай.

У існуючых умовах інтэнсіўнай інфарматызацыі навучальнага працэсу памылковым можна лічыць «рэвалюцыйны» пераход ад традыцыйнай методыкі навучання замежным мовам да інавацыйнай. Гэты працэс павінен уяўляць сабой планамерную эвалюцыю. Таму, нават ва ўмовах 100-працэнтнай забяспечанасці працоўных месцаў вучняў у аўдыторыі сучаснымі камп'ютарамі, нельга цалкам адмаўляцца ад друкаваных дыдактычных матэрыялаў: падручнікаў, дапаможнікаў, аўтэнтычных часопісаў, газет і г. д. Падобнае камбінаванне будзе служыць на карысць павышэння цікавасці вучняў да аўдыторнай працы за кошт забеспячэння большай разнастайнасці відаў пазнавальнай дзейнасці.

Адным з прагрэсіўных новаўвядзенняў у арганізацыі аўдыторнай працы пры навучанні замежным мовам можа стаць выкарыстанне сучаснай інтэрактыўнай дошкі, якая дае шырокія магчымасці ў плане якасці прадстаўлення навучальнага матэрыялу навучэнцам і магчымасцяў трохбаковага ўзаемадзеяння «выкладчык-навучэнец-камп'ютар». Зразумела, выкарыстанне такога абсталявання патрабуе наяўнасці спецыяльных навыкаў працы як з самой інтэрактыўнай дошкай, так і з камп'ютарам, а для распрацоўкі вучэбнага матэрыялу неабходна ўмець падрыхтаваць яго ў спецыяльных камп'ютарных праграмах. Але пры наяўнасці названых навыкаў ёсць магчымасць значна разнастаіць ход урока за кошт выкарыстання інтэрактыўных аўдыёвізуальных матэрыялаў, што, у сваю чаргу, станоўча адаб'ецца на матывацыі навучэнцаў. У сувязі з гэтым выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі ў вучэбнай аўдыторыі можна лічыць пераважна пазітыўным, калі не прымаць у разлік высокі кошт абсталявання і неабходнасць арганізацыі спецыяльных заняткаў для падрыхтоўкі педагогаў.

Зразумела, кожнае з разгледжаных у дадзеным артыкуле пытанняў, якія датычацца асаблівасцяў эвалюцыі методыкі выкладання замежных моў ва ўмовах паўсюднага актыўнага ўкаранення ў навучальны працэс сучасных інфармацыйных тэхналогій, не мае адназначнага адказу і заслугоўвае пільнага вывучэння. Бясспрэчнай можна лічыць толькі неабходнасць пазбягаць бязладнасці і спантаннасці ў гэтым цяжкім, але непазбежным пераходным працэсе ад традыцыйных метадаў навучання замежным мовам да сучасных, якія адпавядаюць патрабаванням інфармацыйнага грамадства, якому патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты, здольныя да эфектыўнага саманавучання і самаразвіцця ва ўмовах глабалізацыі і інтэнсіўнага развіцця міжнароднага палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзаемадзеяння.

## Спіс асноўных крыніц

1. Ажель, Ю. П. Особенности внедрения Интернет-технологий в организацию самостоятельной работы студентов при обучении иностранным языкам в неязыковом вузе / Ю. П. Ажель // Молодой ученый. – 2011. – № 6. – Т. 2. – С. 116–119.

2. Балабанов, В. Б. Общие черты эволюции методики преподавания иностранных языков в условиях активного использования современных информационных технологий [Электронный ресурс] / В. Б. Балабанов, Т. Н. Балабанова // Гуманитарные научные исследования. – 2014. – № 9. – Режим доступа: http:// human.snauka.ru/ 2014/09/7851. – Дата доступа: 09.10.2014.

3. Зубов, А. В. Методика применения информационных технологий в обучении иностранному языку / А. В. Зубов, И. И. Зубова. – М. : Академия, 2009. – 141 с.

**УДК 338.46:37**

***А. И. Басова***

*Белорусский государственный университет*

# МАРКЕТИНГОВЫЕ И PR-ТЕХНОЛОГИИ В ФОРМИРОВАНИИ ПОЗИТИВНОГО ИМИДЖА ВЫСШЕГО УЧЕБНОГО ЗАВЕДЕНИЯ

*Образование является неотъемлемой частью жизни общества, от развития которой зависит интеллектуальный и духовный потенциал страны. С проникновением в образовательную сферу рыночных отношений, глобализацией образовательных услуг, с одной стороны, и особенностями демографической ситуации в нашей стране, с другой, роль маркетинговых и PR-технологий в формировании позитивного имиджа высших учебных заведений сложно переоценить. Позитивный имидж вуза не только усиливает значимость отдельного университета, но и влияет на формирование имиджа белорусского образования в целом. Поэтому очень важно уделять вни-*